ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . 3 р. 30 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25,
сакратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ IX.

№ 17 (985) | ПАНЯДЗЕЛАК, 20-га студзеня 1930 г.

Без Ільліча, пад ленінскім кіраўніцтвам

Іменна таму, што мы —бальшавікі, мы пераможам напэўна.

СТАЛІН.

Калі сэрца вялікарнейшага правадыра пролетарскай рэволюцыі перастала біцца, несакрушымая бальшавіцкая партыя шчыльней зімкнула свае шэрагі, яшчэ шчыльней згуртавала вакол сябе пролетарыят і ўсіх працоўных. Бальшавіцкая партыя і ўвесь Комінтэрн з дзесяцігоднай энэргіяй працягвалі пачатую Леніным справу.

Які-ж баланс партыі, якая працуе без геніяльнага кіраўніцтва Леніна вось ужо 6 год? Гэта—запоннае пытаньне кожнага бальшавіка, кожнага пролетара, кожнага, каму дораг лёс комуністычнай рэволюцыі.

Пералічваючы заветы Леніна, яго вернейшы вучань і саратнік тав. Сталін пакляўся тады ад імя ўсёй партыі, усёй рабочай клясы не пашчадзіць сіл сваіх, не пашчадзіць жыцьця свайго, каб з гонарам выконваць іх. Ён пакляўся тады ад імя ўсёй бальшавіцкай арміі верна ЗМАГАЦЦА ЗА ЛЕНІНСКУЮ СПРАВУ.

Прайшло 6 год. Наўрад ці знойдзецца хто-небудзь, хто-б мог адмаўляць нашы бясспрэчныя посьпехі, нашу вернасьць Леніну, посьпехі партыі, усяго Савецкага Саюзу і Комінтэрну, якія ажыцьцяўляюць справу Леніна. Нават нашы самыя злосныя ворагі за скрыгатам зубоў вымушаны прызнаць нашы вялікарнейшыя гаспадарчыя і СОЦЫЯЛІСТЫЧНЫЯ ДАСЯГНЕНЬНІ.

Контр-рэволюцыйны троцкізм, [illegible] выкінуты за межы СССР, разьбіт і сакрушон. Разьбіт ушчэнт, выкрыты—хоць і не дабіты—правы опортунізм. Правая опозыцыя аказалася слабой супроць бальшавіцкай сілы ленінскай партыі, супроць буйных прыростаў соцыялізму, мы ўмацавалі ленінскую партыю, мы ператварылі яе ў МОЦНАЙ, ЯК НІКОЛІ.

Ленін марыў аб дзесятках тысяч трактароў, а мы пакрываем Савецкія палі новымі і новымі магутнымі трактарнымі калёнамі. Ленін гаварыў аб электрафікацыі, як аб важнейшым зьвяне соцыялізму і як зяніцу вока бярог Волхаўбуд і клапаціўся аб ім. А мы дакончылі Волхаўбуд, пабудавалі магутную Закаўкаскую электростанцыю, шпарка пасоўваем наперад САМУЮ МАГУТНУЮ ДНЯПРОЎСКУЮ СТАНЦЫЮ, УЗЬНІМАЕЦЦА СЬВІРБУД І ДЗЕСЯТКІ ІНШЫХ БУЙНЫХ ЭЛЕКТРОСТАНЦЫЙ.

Ленін гаварыў аб неабходнасьці індустрыялізаваць краіну. Мы далёка ўперад пасунулі Савецкую прамысловасьць. ТРЫНАЦЦАЦЬ МІЛІЯРДАЎ РУБЛЁЎ МЫ ўкладаем у народную гаспадарку СССР у гэтым годзе. Гэта такая сума, аб якой некалькі год назад мы і марыць не маглі.

А тэмпы колгаснага руху? Яны пакінулі далёка ззаду ўсе нашы разьлікі. Мы будуем ужо раёны суцэльнай колектывізацыі (Паўночны Каўказ, Сярэдняе Паволжжа, Ніжняе Паволжжа). Непасрэдна перайшлі да ПРАКТЫЧНАЙ ЛІКВІДАЦЫІ КУЛАЦТВА ЯК КЛЯСЫ.

Пролетарыят моцна абапіраючыся на беднату і ў саюзе з серадняком БУДУЕ Ў ВЁСЦЫ СОЦЫЯЛІЗМ. Разьбіты да шчэнту прадраканьні капіталістых, „прароцтва" троцкістых і „плян" на ўрастаньне кулака ў соцыялізм—правых опозыцыянэраў.

Мы ўзмацнілі і зрабілі несакрушымы саюз з рабочых і сялян!

Мы ўмацавалі Савецкі Саюз. Народы, якія былі раней пад цяжкім ботам царызму, зараз уваходзяць вольна ў саюз Савецкіх Рэспублік і пад кіраўніцтвам ленінскай партыі ў агульнай вялікай сям'і ўсіх савецкіх народаў будуюць соцыялізм. Іх працу ахоўвае НЕСАКРУШЫМАЯ ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ, якая паказала нам зусім нядаўна, што не пагас баявы комуністычны дух чырвоных байцоў, што вялікая міжнародная салідарнасьць і сьвядомасьць першай у сьвеце соцыялістычнай арміі.

Мы таксама з гонарам выканалі свой МІЖНАРОДНЫ АБАВЯЗАК. Мы ўсімі сіламі ўмацоўвалі „Комуністычны Інтэрнацыянал і садзейнічалі сусьветнай рэволюцыі. Мы не пакідалі без дапамогі нашых братоў, якія змагаюцца за мяжой. Мы дапамагалі нашым братэрскім комуністычным партыям. Мы дапамаглі ім усім нашым бальшавіцкім вопытам, вопытам 30-цігадовай партыі, створанай і выхаванай Леніным.

Мы дапамаглі секцыям Комуністычнага Інтэрнацыяналу стаць моцнымі бальшавіцкімі партыямі, вымесьці са сваіх шэрагаў троцкістых і правых ухілістых. Мы дапамаглі Комінтэрну СТАЦЬ МОЦНЫМ МІЖНАРОДНЫМ ШТАБАМ ПРОЛЕТАРСКАЙ РЭВОЛЮЦЫІ. Мы высока трымалі сьцяг Леніна гэтыя 6 год, НІ РАЗУ не выпусьцілі яго. Мы кожны свой шаг крытыкуем па-ленінску і правяраем вопыт мільённых мас.

Мы добра ведаем, што наперадзе непачаты край работы, што ёсьць уйма цяжкасьцей, але мы былі-б дрэннымі ленінцамі, калі-б сталі уныватць хаця б на секунду. Мы ня маем да гэтага ніякіх падстаў. НЯХАЙ ДРЫЖАЦЬ ВОРАГІ ПРОЛЕТАРСКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ ПРЫ ВІДЗЕ НАШЫХ ПОСЬПЕХАЎ. Мы не праўвялічваем іх. Але мы ня маем права і прыўменшаць гэтыя посьпехі.

6 ГОД МЫ ІДЗЕМ БЯЗ ЛЕНІНА, АЛЕ КОМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ, ЯКАЯ КІРУЕ ПРАЛЕТАРСКАЙ РЭВОЛЮЦЫЯЙ, НІ РАЗУ НЕ ЗЬВЯРНУЛА СА ШЛЯХУ, ПАКАЗАНАГА ПРАВАДЫРОМ. У ГЭТЫМ НАША НЕВЫЧАРПАЛЬНАЯ СІЛА.

За больш рашучую барацьбу з усялякімі опортуністычнымі хістаньнямі ад генэральнай лініі партыі

Пастанова Бюро ЦК ЛКСМБ па пытанню аб позіцыі тав. Чарвякова ў барацьбе з правым ухілам і нац.-дэмократызмам ад 12-1—1930 г.

1. Бюро ЦК ЛКСМБ цалкам далучаецца і ўхваляе пастанову пленуму ЦК КП(б)Б па пытаньню аб позіцыі т. Чарвякова ў барацьбе з правым ухілам і нац.-дэмакратызмам, які (Чарвякоў) на працягу доўгага перыяду і да апошняга часу выказваў і абараняў шэраг праваўхілісцкіх установак, як-та: падтрымка лёзунгу Бухарына „збагачайцеся", салідарызаваўся з права-опортуністычнымі поглядамі Бухарына ў „Заметках эканаміста" змазваньні кіруючай ролі рабочай клясы ва ўсім сац. будаўніцтве, затушоўваньнем вядучай ролі прамысловасьці ў першую чаргу цяжкай індустрыі ў соц. рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, ідэалізацыі буржуазна-нацыяналістычных партый у мінулым, падмену пролетарскага характару Кастрычнікавай Рэвалюцыі ў Беларусі дробна буржуазным характарам, творыя ўступак інтэлігэнцыі і іншыя і ня прымаў актыўнага ўдзелу ў барацьбе супроць правага ухілу і нац. дэмакратызму.

2. Бюро ЦК прапануе яшчэ больш узмацніць у комсамольскай організацыі барацьбу з усялякімі опортуністычнымі хістаньнямі ад генэральнай лініі партыі і шырока растлумачыць у комсамольскай організацыі сацыяльныя карэньні правага ўхілу, нац.-опортунізму і нац.-дэмократызму.

Шклоў, ад нашага спэцкора

На працэсе аб самагубстве рэдактара насьценгазэты Багайскага

Учора 19 студзеня, на ранішнім пасяджэньні скончыўся допыт сьведкаў.

Допыт сьведкаў высьветліў поўны малюнак тых абставін, якія прывялі Багайскага да несвоечасовай сьмерці.

Выкліканыя сьведкі: дырэктар фабрыкі тав. Астапенка, рабочыя заводу—Глезер і інш. далі ацэнку гэтаму здарэньню, як політычнаму акту клясавых ворагаў.

На вячэрнім пасяджэньні пачаліся спрэчкі бакоў. У спрэчках выступілі прадстаўнікі грамадзкага абвінавачваньня т. т. Пераход, Табайнік і рабочы фабрыкі „Спартак".

Перапоўненая заля фабрычнага клюбу з асаблівай напружанасьцю выслухала прамову дзяржаўнага абвінаваўцы тав. Міхайлава.

Тав. Міхайлаў, так як і прадстаўнікі грамадзкага абвінавачаньня, расцэньвае дзейнасьць двух падсудных як контр-рэвалюцыйнае дзеяньне.

Кваліфікуючы кожнага з іх паасобку, тав. Міхайлаў патрабуе падсуднаму Шкураву меру сацыяльнай абароны—пяць гадоў зьняволеньня ў лагеры асабовага прызначэньня.

Прамовы абаронцаў пачаліся позна ўвечары.

Прыгавор чакаецца сёньня.

А. Каліта.

Фашысцкі рэжым у Польшчы разрастаецца

«Толькі масы пролетарыяту і сялянства змогуць ні зрынуць гэты рэжым»

ВАРШАВА, 18. Дэпутат беларускага рабоча-сялянскага блёку Гаўрылюк выступіў у сойме з рэзкімі выкрыцьцямі політыкі ўраду і так званай «опозыцыі». Гаўрылюк падкрэсьліваў, што Бартэль у свой час разграміў стотысячную масавую партыю—беларускую Грамаду. Зараз ён працягвае крывавую політыку фашызму ў адносінах да нацыянальнай меншасьці і польскага пролетарыяту. „Опозыцыя" якая складаецца з буржуазных партый і соцыял-фашыстых, на справе падтрымлівае фашысцкі рэжым. Гэты рэжым будзе ні зрынут узброенай барацьбой рабочых і сялянскіх мас. Прамова Гаўрылюка была спаткана бурнай авацыяй левых рабоча-сялянскіх дэпутатаў і шалёнай лаянкай з боку буржуазных партый.

21 зьлёт марскіх драпежнікаў

Мэта іх зьлёту—падрыхтоўка вайны

21-га студзеня 1930 году ў Лёндане адчыняецца конфэрэнцыя 5 марскіх дзяржаў. Гэта трэцяя па ліку конфэрэнцыя пасьля сусьветнай вайны зкліканая, як і папярэднія, ня вырашыць асноўныя пытаньні, як я звязаны з сапраўдным рэальным скарачэньнем узбраеньняў, а ўстанавіць тыя неабходныя суадносіны марскіх сіл, якія ў першую чаргу жаданы Паўночна Амэрыканскім Злучаным Штатам.

Зусім правільна зазначае орган англійскай компартыі „Дэйлі Уоркер" які гаворыць, што прадстаячая Лёнданская конфэрэнцыя марскіх дзяржаў прывядзе не да разбраеньня, а наадварот да новых узмоцненых узбраеньняў. І гэта сапраўды так.

Нам добра вядома адно, што на моры робіцца тое-ж самае, што і на сухазем'і: імпэрыялістыя шалёна рыхтуюцца да новай бойні, і ў першую чаргу гэтая падрыхтоўка новай бойні накіравана супроць Савецкага Саюзу. У гэтым ня можа быць ніякага сумненьня. Спрэчкі на Лёнданскай конфэрэнцыі будуць весьціся толькі па пытаньню аб тым, пры дапамозе якіх вайсковых судоў і дальнабойных гармат павінна весьціся марская вайна.

Але гэта не тэхнічныя, а політычныя спрэчкі. Кожная імпэрыялістычная дзяржава бароніць той тып судноў, які складае яе галоўныя сілы на моры; кожная імкнецца зьнішчыць альбо скараціць да мінімуму тыя марскія ўзбраеньні якімі багаты яе сапернікі.

Такім чынам кожны з драпежнікаў жадае сабе забясьпечыць перамогу: на выпадак вайны з іншымі імпэрыялістамі і „лепшы кавалак здабычы" на выпадак вайны супроць СССР бо „лепшыя кавалачкі" у капіталістычным сьвеце заўсёды пападаюцца мацнейшаму.

Адсюль спрэчкі паміж Англіяй і Амэрыкай з-за крэйсэраў, паміж Англіяй і Францыяй з-за падводных лодак, паміж Францыяй і Італіяй з-за агульных суадносін сіл (такія спрэчкі ідуць паміж Амэрыкай і Японіяй).

Імпэрыялістыя усяк імкнуцца якнебудзь старгавацца. Для гэтай мэты Брыян вядзе ў Жэневе клапатлівыя перагаворы з Гендэрсонам і Грандзі. Але спробы ня прывялі ні да чаго. Пасьля ўсіх стараньняў Макдональда, Амэрыка высоўвае патрабаваньні па пытаньні аб крэйсэрах.

Супярэчнасьці паміж імпэрыялістамі надзвычайна моцныя і надзвычайна абвостраны цяперашнім крызісам капіталізму.

Іскры радыё

— У Маскву прыбыў вядомы амэрыканскі эканоміст проф. Масачузэскага унівэрсытэту Альбэрт Джонисон. Проф. Джонисон выдаў у Злучаных Штатах альбом дыяграм, якія малююць разьвіцьцё народнай гаспадаркі СССР у разрэзе пяцігадовага пляну.

Клясавыя баі пролетарыяту з фашызмам

ПРАГА, 19-1. Уласьнікі гутаў у Ліжнім Рыхнове і Алове звольнілі тысячу рабочых, пераважна сяброў чырвонага саюзу шкляроў. Рабочыя шкловых заводаў абвясьцілі забастоўку. Компартыя заклікала рабочых пашырыць распачатую стачку ва ўсеагульную забастоўку ўсіх рабочых шкляной прамысловасьці з мэтаю барацьбы супроць капіталістычнай рацыяналізацыі і супроць абаронцаў сацыял-фашыстаў.

НЬЮ-ЁРК, 19-1. У штаце Ілінойс распачалася забастоўка 1100 гарнякоў. Рэфармісцкія лідэры саюзу абвясьцілі забастоўку «незаконнай» і распачалі вербаваць штрэйкбрэхераў.

Компартыя Нямеччыны пад пагрозай забараненьня

Соцыял-дэмократычны ўрад пачынае рашучы паход супроць компартыі і ўсяго рабочага руху

Пролетарыят Нямеччыны ня дасьць сябе справакаваць. Ён сам выбярэ момант для рашучага бою не на жыцьцё, а на сьмерць

БЭРЛІН, 16. Прускі міністр унутраных спраў, соцыял-дэмократ Гржэзінскі забараніў **ўсе сходы пад адкрытым небам, паходы і дэмонстрацыі»**. Адначасова Гржэзінскі прадпісаў паліцэйскай уладзе **«бязьлітасна, усімі сродкамі падаўляць спробы парушэньня гэтай забароны»**. Перад выданьнем такога распараджэньня Гржэзінскі выступіў у прускім ляндтагу (парляманце) з прамовай, у якой ясна даў зразумець, што **ўсе гэтыя меры накіраваны выключна супроць компартыі і рэволюцыйных рабочых. Разам з тым ён адкрыта пагражаў компартыі забараненьнем.**

Усе буржуазныя і соцыял-дэмократычныя газэты вітаюць дзеяньні Гржэзінскага.

17-га студзеня па загаду начальніка паліцыі соцыял-дэмократ Цэргібеля **конфіскаван нумар комуністычнай газэты „Ротэ Фанэ" Загад матывіруецца паміж іншым тым, што некаторыя артыкулы газэты „падбухторваюць да клясавай барацьбы"**. Паліцыі ўдалося, аднак, конфіскаваць толькі частку надрукаваных экзэмпляраў газэты. Астатняя частка была ўжо распаўсюджана.

У сувязі з такім становішчам Бэрлінскі акруговы камітэт компартыі заклікае рабочых даць адпор націску соцыял-фашызму. 17-га студзеня ва ўсіх раёнах Бэрліну адбудуцца мітынгі протэсту.

На повад апошніх паліцэйскіх мерапрыемстваў орган компартыі „Ротэ Фанэ" піша: „Соцыял-дэмократычны ўрад пачынае рашучы паход супроць компартыі і ўсяго **рабочага руху.** Але разьвіцьцё клясавай барацьбы ў Нямеччыне дасягнула такой вастраты, што **адступленьня быць ня можа.** Гаспадарчы крызыс, масавая галеча і цяжкая патрэба узьнімаюць пролетарыят да барацьбы за свае інтарэсы. **Соцыял-дэмократыя организуе контр-рэволюцыйную грамадзянскую вайну. На яе падае адказнасьць за кроў рабочых,** якая будзе праліта. Перад намі ужо не падрыхтоўка, а пачатак фашысцкай дыктатуры, якая створана акрываўленымі рукамі соцыял-дэмократычнай партыі. Але гэтыя паны памыляюцца ў сваіх разьліках. **Нямецкі пролетарыят ня дасьць надзець на сябе кандалы. Рэволюцыйная хваля расьце нястрымана. Пролетарыят ня дасьць сябе справакаваць, але сам выбярэ момант для рашучага бою не на жыцьцё, а на сьмерць.** Зараз неабходна згрупаваць усе сілы на стварэньне спасылак для **пролетарскай дыктатуры.** На катаўскую програму фінансавага капіталу, мы, як бальшавікі, адказваем **заклікам да рэволюцыйнай масавай бойкі па усёй лініі.** Мы ідзём у гэтую бойку з разгорнутым чырвоным сьцягам. Мы моцна трымаем яго ў руках і узьнімаем яго над мільённымі масамі нямецкага пролетарыяту.

АБВШ—кузьня чырвоных камандзіраў

Праз організацыю ўдарных разьдзелаў дасягнем рэволюцыйных тэмпаў у баявой падрыхтоўцы

У СЬЦЕНАХ ШКОЛЫ

Комсамольская організацыя АБВШ зьяўляецца адною з баявых організацый, дзе выкоўваюцца кадры чырвоных камандзіраў.

АБВШ па складу—комсамольская бо толькі нязначная колькасьць курсантаў не састаіць у КСМ або у партыі.

Комсамольская організацыя налічвае каля 40 проц. рабочых. Значную колькасьць складаюць былыя комсамольскія работнікі, былыя савецкія і грамадзкія працаўнікі.

Правым ўхілістым дадзен рашучы адпор

Організацыя за апошнія месяцы перажыла суровы урок у барацьбе за лінію партыі. У школе мела месца вылазка правага ўхілістага КУЗЬМІЦКАГА. Праз два-тры тыдні пасьля гэтага выступленьня, комсамольскія масы пачалі шумець, дыскусіраваць аб тым, што выступаюць некаторыя з правай прапагандай (Маліноўскі, Мейсіенка), з яўна-троцкісцкімі поглядамі (Быкаў Зянькевіч і Лепяшынскі), гэтыя выступленьні не выпадковы і трэба сказаць, ШТО СВАЕЧАСОВАГА РЭАГАВАНЬНЯ НА ІХ НЯ БЫЛО.

Правыя і троцкісты работу сваю праводзілі рознымі метадамі і формамі. Адстойвалі свае погляды на політ-занятках, вялі гутаркі індывідуальна, а троцкісты БЫКАЎ, як высьветлілася, праводзіў работу доўгі час і меў сувязь з троцкістымі.

Але організацыяй прыняты меры. Дана політычная ацэнка вылазкам правых і троцкістых. Выключаецца з партыі троцкіст Быкаў, а з комсамолу—Зянькевіч і Лепяшынскі.

Не прашло і паўмесяца, — зноў навіна. Некаторая частка комсамольцаў і нават актывістых (Жгараў, чл. бюро колектыву) выступаюць супроць партыйнага і комсамольскага кіраўніцтва, супроць вайсковых палажэньняў.

Пасьля першых урокаў політычнага прарыву, комсам. кіраўніцтва школай несарганізавала масу комсамольцаў, каб даць належны адпор гэтым правым. Былі выпадкі, калі ў школу і комсамол пралазілі соцыяльна-варожыя элементы (Ермалінскі — сябра бюро колектыву КСМ школы, сын паліцэйскага).

Шэфы... дзе вы?

Сувязь з рабочымі організацыямі і да апошняга часу застаецца слабою, тут работа пабудавана па дыплёматычнаму. Вывучаюць упаўнаважаных ад ячэек школы, ад заводу „Энэргія“ і таварнай МББ, якія рэдка сустракаюцца і работы ніякай не вядуць.

Ад мясцовых організацый КСМ. Мен. АК КСМ і Кастрычнікаўскага райкому КСМ ніколі ня было ніводнага прадстаўніка ў школе, хаця, формальна, на словах, апошнія абяцаюць дапамагчы ў рабоце і гэтак далей.

Мы за правядзеньне генэральнай лініі партыі

Толькі ў апошні час організацыя ўзяла рашучы курс на поўнае зьнішчэньне былых прарываў. Комсамольскія ячэйкі больш сталі зьвяртаюць увагу на вайсковую падрыхтоўку і ўзмацненьне дысцыпліны сярод курсантаў.

Праводзяцца суботнікі, многія комсамольцы-курсанты ўступілі ў члены ашчадкасы.

Да гэтага часу з боку комсамольскіх організацый не ўдзялялася належнае ўвагі эканомнаму выдаткаваньню сродкаў і маёмасьці. Зараз узяты курс на ашчадныя адносіны да дзяржаўнай маёмасьці і эканомію сродкаў, у чым ужо маюцца значныя дасягненьні.

Пазачарговыя перавыбары прэзыдыумаў ячэек і бюро колектыву КСМ паказалі, што актыўнасьць курсантаў-комсамольцаў узрасла, павялічылася політычная сьвядомасьць. У новае бюро колектыву абрана 75 проц. рабочых.

Камісія ПУОКР'а, абсьледаваўшая становішча комсамольскай організацыі, дала цэлы шэраг практычных паказаньняў, як у далейшым праводзіць работу.

Зараз, у перыод абвостранай класавай барацьбы, патрэбна асабліва сачыць за тым, каб у вайсковыя часткі не пралезьлі нашыя ворагі.

У правядзеньні ўсіх пастаўленых партыяй перад вайсковай школай задач, значную ролю адыгрывалі і павінны адыгрываць комсамольскія і партыйныя організацыі, дзеля гэтага і патрэбна штодзённа весьці работу па ўмацаваньню дысцыпліны, баяздольнасьці і політычнага выхаваньня курсантаў.

Б. Ф. Гузікаў.

ОРГАНІЗАВАЛІ ЎДАРНЫ РАЗЬДЗЕЛ

У кулямётнай роце АБВШ зараз організаваны ўдарны кулямётны разьдзел, які паставіў сабе задачай на працягу сваёй вучобы, правесьці наступнае:

Не мець ніводнага праступку. Выразна, хутка і дакладна выконваць загады і наказы. Гутарыць усюды на беларускай мове. Сыстэматычна вывучаць бягучыя падзеі у галіне ўнутранога і міжнароднага становішча СССР. Займацца рэгулярна стралковай падрыхтоўкай у пазашкольны час. Ніводнага курсанта, які-б адставаў у вучобе. **У гэты разьдзел увайшло 8 партыйцаў, 25 комсамольцаў і 2 беспартыйных.**

Трэба адзначыць, што гэты разьдзел мае ўжо значныя дасягненьні:

Павысілася чоткасьць ва ўсёй рабоце і выкананьні ўсіх загадаў, дысцыпліна паднялася і інш. Стралковая трэніроўка праводзіцца рэгулярна. Курсанты з вялікай ініцыятывай увесь час займаюцца вучобай, вольны час скарыстоўваюць для разьвязаньня вайсковых тактычных задач і інш.

Утварэньне такіх ударных разьдзелаў набывае асабліва вялікае значэньне. Трэба, каб комсамольскія і партыйныя організацыі школы павялі адпаведную работу з тым, каб праз ударныя разьдзелы дабіцца яшчэ большага штурхана ўва ўсёй рабоце і вучобе школы.

М. Федаровіч.

Ударным тэмпам

На працягу 3-х год навучаньня ў школе курсант набывае тэорэтычныя і практычныя веды па ўсіх галінах вайсковай і грамадзкай работы і выходзіць політычна сьвядомым класава-вытрыманым камандзірам, які ўмацціме баяздольнасьць Чырвонай арміі, уліўшыся пасьля сканчэньня школы ў яе шэрагі.

Паміж асобнымі разьдзеламі шырока разгорнута соцыялістычнае спаборніцтва, організаваны ўдарныя брыгады, якія значна паляпшаюць становішча ўсёй работы і гэтым самым узьнімаюць баяздольнасьць школы.

Пытаньні колектывізацыі набылі асаблівы характар. Комсамольская і партыйная організацыі ўпарта займаюцца гэтым пытаньнем, штодзённа вядучы адпаведную работу сярод курсантаў, каб апошнія ў сваёй практычнай рабоце у лістох дадому, пры экскурсіях агітавалі за разгортваньне колектывізацыі.

Уся пастаноўка работы ў школе, па страявых занятках, політычным выхаваньні і ўдзеле курсантаў у грамадзкай рабоце праводзіцца ўдарным тэмпам.

Курсант Сьцяпан Навальчук.

Соцспаборніцтва... ня наша справа

Перавыбарчы сход прэзыдыуму комсамольскай ячэйкі 2-й батарэі АБВШ прайшоў вельмі жыва. На агульным сходзе курсанты падкрэсьлівалі самакрытыкай ўсю работу ячэйкі і выявілі шэраг недахопаў.

Мелі месца выступленьні троцкістых (Меламэд), а таксама і прывы правага ўхілу на практыцы. Некаторыя комсамольцы далёка ня прыкладныя ва ўзьняцьці дысцыпліны і паляпшэньні якасьці вучобы. Меліся выпадкі абгавараньня загадаў.

Шмат хто з курсантаў не разумеў самакрытыкі і накіроўваў яе не на барацьбу за лінію партыі, за вайскова-політычную вучобу і дысцыпліну, а на абгавараньне загадаў і распараджэньняў.

Соцыялістычнае спаборніцтва ня стала метадам у штодзённай працы. Ударнікі працуюць яшчэ не па ударнаму.

Дрэнна пастаўлена выхаваўчая праца, ад чаго актыўнасьць мас перарасла кіраўніцтва. Зьявілася „комуна“, якая хацела зьмяніць партыйную і комсамольскую ячэйку. На падставе ўсіх гэтых фактаў сход прызнаў працу прэзыдыуму **нездавальняючай.**

Новаму прэзыдыуму, які значна адновіўся за кошт курсантаў-рабочых, трэба перабудаваць сваю працу, кіруючыся пастановамі другой усесаюзнай нарады сакратароў ячэек і дырэктывамі ПУР'а аб комсамольскай рабоце ў Чырвонай арміі.

Жукоўскі.



Шэфы вывучаюць вінтоўку

Курсанты-комсамольцы ў колгасе

У сьнежні месяцы 29 году, па ініцыятыве партыйнай і комсамольскай ячэек другой батарэі АБВШ, разам з беспартыйнымі курсантамі, была наладжана экскурсія ў колгас „Бальшавік“.

Курсанты аглядалі ўсю маёмасьць колгасу, гутарылі з колгасьнікамі на розныя тэмы аб рабоце ў колгасе, аб бытавых умовах і шмат іншым.

Колгасьнікі задаволена апавядалі курсантам аб сваім жыцьці.

Затым старшыня колгасу курсантам даў падрабязную інформацыю аб становішчы і організацыі колгасу і яго дасягненьнях. Спачатку ў колгас увашло 11 сем'яў: 2 сям'і беднякоў і 9—сельгаспадарчых. Гаспадарка гэтых сем'яў складалася з аднаго каня і 7 нікчэмных кароў.

Зараз колгас значна ўзрос,—маецца **29 коняй, 57 кароў**, *а становішча гаспадаркі з кожным днём паляпшаецца.*

Трэба будзе ўсім астатнім падразьдзелам школы рабіць такія экскурсіі ў колгасы, праводзіць там адпаведную работу культурна-масавага характару, змагацца за арганізацыю новых колгасаў.

Мядзьведзеў.

Рыхтуйся да вясеньняга севу

Больш настойлівасьці і ініцыятыв...

павінны праявіць комсамольскія ячэйкі ў раб... па падрыхтоўцы да вясеньняй пасяўной камп...

Пранізіць усю работу мэтадамі соцспаборніцтва

ОРГАНІЗАВАЛІ КОЛГАС

Пленум Чашніцкага райкому комсамолу, які нядаўна адбыўся паставіў перад організацыяй задачу аб 100 пр. уцягненьні усіх комсамольцаў у вясеньне-пасяўную кампанію і ў работу па суцэльнай колектывізацыі раёну.

Гэтая пастанова выклікала вялікі пералом у рабоце Чашніцкай комсамольскай організацыі. Чашніцкія



Ачышчаюць насеньне

ячэйкі склалі ініцыятыўныя групы з комсамольцаў вёскі Зарэчная Слабада, якія праводзілі работу па організацыі колгасаў. У выніку настойлівай работы комсамольскай групы, **вёска Зарэчная Слабада аб'яднана ў колгас, у які ўваходзіць 45 двароў.**

У колгас уліося 12 комсамольскіх гаспадарак. Зараз гэтая ячэйка праводзіць работу па організацыі колгасу на астатніх вёсках Чашніцкага сельсавету. Для пасьпяховага выкананьня гэтай работы ячэйкі склалі на добраахвотных пачатках ініцыятыўную групу з 36 асоб.

Разам з добрымі прыкладамі і практычным удзелам ячэйкі ў справе колектывізацыі сельскай гас...даркі, маецца і шмат адмоў...бакоў, з якімі ячэйка паві... весьці рашучую барацьбу. Час... комсамольцаў яшчэ стаіць у ... ад справы колектывізацыі. Ком...мольцы-саматужнікі, як першай і другой ячэйкі, нічога не зрабілі... аб'яднаньня саматужнікаў у ко...тывы—адзін з іх (цырульні... членам якога быў сакратар комса...скай ячэйкі, разваліўся. Бывае самі так, што комсамольцы ў ко...тывах не зьяўляюцца прыклад... ў барацьбе за працоўную дысц...ліну.

Усё гэта асабліва востра ста... пытаньне перад ячэйкай аб ...лізацыі ўвагі усіх комсамольца... справы колектывізацыі і падр...тоўкі да вясеньняй пасяўной к...паніі. Трэба аддаць асаблівую ў... культурна-выхаваўчай рабоце ў ...гасах,—толькі тады мы даб'... выкананьня задач, пастаўленых ...рад намі партыяй і комсамолам.

Дамароцк...

Выправіць памылкі на хаду

Разгарнуць растлумачальную работу на прадпрыемст... вакол колектывізацыі сельскай гаспадаркі

Прыблізна тыдзень таму назад у Менску пачалі сваю працу курсы для рабочых, якія накіроўваюцца на сталую працу ў колгасы. На курсах займаецца 127 чал. з Менску і Барысава.

Для тэорэтычнай падрыхтоўкі гэтых таварышоў засталося мала часу,—менш чым праз два тыдні яны павінны выехаць у колгасы.

Нам прыходзіцца зараз сыгналізаваць аб некаторых ненармальных зьявішчах, якія назіраюцца ў рабоце курсаў.

Па-першае—адсутнічае патрэбная літаратура ў бібліотэчках. Дакладчык па сельска-гаспадарчай кооперацыі ня даў яскравых адказаў слухачом. Шэраг іншых пытаньняў дрэнна растлумачаны слухачом. На курсах маецца адзін консультант, які ня мае магчымасьці адказваць курсантам на незразумелыя пытаньні.

Па-другое—частка рабочых некаторых фабрык і заводаў пры вылучэньні сваіх таварышоў на працу ў колгасы—ня ведалі і да гэтага часу не ўразумелі мэт і задач кіраўніцтва рэконструкцыяй сельскай гаспадаркі рабочай клясай.

На рымарскай ф-цы адсталыя рабочыя выказваюць такія думкі, што сялянства ня пойдзе ў ко...сы. (!?) На некаторых прадпры...ствах (ліцейнай ф-цы, ф-цы „...раджаньне“) вакол вылучэньня ...бочых на сталую работу ў кол... **ня была створана шырокая ...мадзкая думка.**

Там, дзе была праведзена ра... („Бальшавік“, „Энэргія“ і ... такога становішча ня было.

Нельга не абыйсьці моўчкі ... сама таго факту, што пасо... прадпрыемствы (Белдзяржбуд) лічылі рабочых - курсантаў—... гульшчыкамі. А рэдактар нас... най газэты Белдзяржбуду тава...шоў, якія займаюцца на ку... прыгразіў працягнуць у пась... эце, як прагульшчыкаў.

Трэба безадкладна прыняць ра...чыя захады да выжыцьця не...мальных зьявішч на курсах, ... галіне вучобы, так і наведва... занятках. Трэба ўзмацніць рас...мачальную работу на фабрык... заводах вакол пытаньня колект...зацыі вёскі і ролі рабочай клас... гэтым надзвычайна важным ...прыёмстве.

Х. Б—

У дапамогу Раб.-Сял. Інспэкцыі

Лістак „Лёгкай кавалерыі“

У значнай частцы раёнаў адбываюцца провалы і зрывы зьлётаў „Лёгкай Кавалерыі“

Кіраўніцтва комсамольскіх камітэтаў ня ўсюды мобілізавала масы на правядзеньне баявой работы

Аб правалах у баявой рабоце

...раг матар'ялаў, наступаючых ...ец, гавораць аб тым, што ў ...най частцы раённых комсамольскіх організацыях з правядзеньнем ...у „Лёгкай Кавалерыі“ справа ...іць надта кепска.

...веданыя зьлёты „Л. К.“ у ...ыцкім, Касьцюковіцкім і інш. ...ах, матар'ялы аб якіх мы сёньня ...руем, гавораць аб тым, што ...сюды да гэтага важнага полі... ...нага мерапрыемства падыходзяць з патрэбнай увагай і сур'...сьцю, што пастанова ЦК ...МБ і ЦКК КП(б)Б, па пытаньню правядзеньня зьлётаў, ня ўсюды выконваецца.

...каторыя камітэты і ячэйкі падходзяць да гэтай справы, фор...а, б'юрократычна, грамадзкая ...а навокал работы „Л. К.“ і ...дзеньня зьлётаў не ўтвараецца. Факты,—на зьлёт „Л. К.“ Аза...кага раёну (Мазыршчына) са...ся ўсяго 21 чалавек, з іх ...кі 5 з вёсак; на зьлёт Касьцю...каскага раёну (Магілеўшчына) ...на было зьявіцца больш 200 ...атаў, а прышло 50, што цал... падцьвярджае сказанае. Да... „паказальны“ факт недаму... ...ных адносін да зьлёту „Л К.“ ...ы ў Полацку дзе на зьлёт ...лася больш 100 делегатаў, ...і зьлёт сарваўся. Гэты факт ...раз падцьвярджае недбай... адносіны да такога важнага ...ычнага мерапрыемства.

Пункты ўвагі...

...рад комсамольскай організацыяй на сёньняшні дзень, як ніколі, ...ўляецца актуальнейшай за... ...перабудова тэмпаў саюзнай ...ы, прыстасаваньня іх поў... ...ю да тэмпаў соцыялістычнага будаўніцтва.

...аленьскі пленум ЦК КП(б)Б і ...ум ЦК ЛКСМБ абгаварваючы ...ньне аб комсамоле, зазначылі ...абую перабудову саюзнай ра... і выказаліся за рашучы по... ...ў гэтым напрамку. „Лёгкая ...ерыя“, зьяўляючыся адной з ...організацыі мас комсамоль... ...моладзі, адыгрывае адну з важных роляй у справе перабудовы работы комсамолу.

Абвешчаны комсамолам трохмесячнік пролетарскай беларускай культуры і культуры нацыянальных меншасьцяў, падрыхтоўчая работа і правядзеньне веснавой пасяўной кампаніі на поўнае выкананьне промфінплану гэтыя пытаньні на сёньняшні дзень павінны стаць пунктам увагі ўсёй комсамольскай організацыі з тым, каб гэтыя мерапрыемствы поўнасьцю выкарыстаць для перабудовы саюзнай работы, каб часьцякова справіцца з ажыцьцяўленьнем задач партыі на шырокім тэмпы соцыялістычнага будаўніцтва, на ліквідацыю кулацтва, як класы. Між тым некаторыя камітэты, дзякуючы сваёй закасьцянеласьці, консерватызму, бюрократычным адносінам да „Л. К.“, ня толькі не садзейнічаюць яе руху, а сваімі адносінамі об'ектыўна угробліваюць жывую ініцыятыву.

Правал наяваму некаторых зьлётаў і зрыў зьлётаў у Полацку трэба расцэньваць, як нездольнасьць гэтых камітэтаў справіцца з ажыцьцяўленьнем політычнага мерапрыемства, як нездольнасьць падхапіць і стаць наперадзе ініцыятывы мас. Усё гэта нельга не расцэньваць, як політычныя промахі ў рабоце.

Побач з гэтым трэба адзначыць на слабасьць увагі за зьлёту „Л. К.“ з боку іншых грамадзкіх організацый. Друкуемыя с ньня матар'ялы таксама гавораць аб гэтым, бо там, дзе адбыліся палу-правалы зьлётаў, грамадзкія організацыі ў падрыхтоўчай працы кепска дапамагалі комсамолу.

Неадкладна трэба...

Адзначаныя недахопы і промахі ў правядзеньні зьлётаў „Л. К.“ павінны быць улічаны зараз-жа тымі раёнамі, дзе яшчэ зьлёты не праведзены, трэба памятаць, што пасьпяховае праведзеньне ўсебеларускага зьлёту „Л. К.“ залежыць ад таго, наколькі гэта мерапрыемства будзе пасьпяхова праведзена на месцах.

У значнай часты раёну зьлёты ўжо адбыліся, але на гэтым затрымлівацца ні ў якім разе нельга. Комсамольскія камітэты і ячэйкі павінны систематычна праводзіць працу па паляпшаньню работы „ЛК“, популярызацыі яе і рашэньняў зьлётаў сярод шырокіх мас комсамольцаў, працоўнай моладзі і дарослых рабочых.

Трэба зьвярнуць увагу на справу распаўсюджаньня вопыту работы „ЛК“, а ў гэтым напрамку ў нас справа абстаіць яшчэ кепска.

Мы хочам зьвярнуць увагу нашых юнкораў на тое, каб палепшыць якасьць матар'ялаў аб працы „ЛК“, якія дасылаюцца ў газэту, каб глыбей асьвятляць яе працу на асобных участках нашага будаўніцтва, на жывых прыкладах, каб паказаць ня толькі, што зроблена, але і як зроблена, якім спосабам. Каб паказаць ня толькі непрацаздольнасьць таго ці іншага атраду, але паказаць, адкуль яна вынікае а гэта а ў нашых матар'ялах вельмі мала.

Слаба выкарыстоўваецца ў працы „ЛК“ і ў правядзеньні зьлётаў такі важны, вялікага выхаваўчага значэньня метад, як соцыялістычнае спаборніцтва.

На гэты участак пры правядзеньні зьлётаў трэба зьвярнуць большую ўвагу.

На хаду, пакуль ня позна, трэба выправіць памылкі і промахі ў правядзеньні зьлётаў „ЛК“, каб справіцца з баявой задачай.

Пузікаў.

...м, дзе гаварылі „раней за дзень“...

...га студзеня ў Касьцюковіцкім (Магілеўшчына) адбываўся „Лёгкай Кавалерыі“, на зьлёт ...лася разам, з мястэчковымі ...лерыстымі“ 50 чалавек, за... 200. Падрыхтоўчая работа ...зьлёту праводзілася слаба, ...клад у ячэйках: Тунічана, ...авое і Мокрае пытаньне аб ...ыхтоўцы да зьлёту абгаварылася толькі на бюро, ня была організавана нават групы ...“, ня гледзячы на тое, што ...находзіліся прадстаўнікі РК ...МБ. Грамадзкая думка аб рабо... „ЛК“ ня створана, ад наПова...ізованых атрадаў на зьлёт ...лася толькі 4 чалавекі.

...зьлёт «ЛК» Кліновіцкага ра...кі адбываўся 7-га студзеня, ...лася 50 „кавалерыстых“, а ...толькі 30 вясковых. Ад 16-ці ...делегатаў зусім ня было, а ...на было зьявіцца 150 чалавек; ...чыная зьлёт прышлося ад... ...ці да 17-га студзеня. Грамадзкай думкі навокал зьлёту і работы груп „ЛК“ ня створана.

Грамадзкія організацыі ў падрыхтоўцы і правядзеньні работы зьлёту, профсаюзны РВК, сэкцыі РСІ удзелу не прымалі. Дзякуючы гэтаму зьлёты не далі патрэбных вынікаў.

Марковіч.



Там, дзе сарваліся зьлёты

Што выявіла абсьледваньне

...упай „Лёгкай Кавалерыі“ ...ельскай ячэйцы ЛКСМБ быладжана абсьледваньне саўгас... ...ячэйкі ЛКСМБ. Група паставіла сабе мэту — праверыць выкананьне дагавору па сац. спаборніцтву,—што конкрэтна зроблена ячэйкай па падрыхтоўцы да пасеўнай кампаніі.

...а дагавору, ячэйка павінна была ...ыць насеньне ў падшэфных ...ах у колькасьці 3.500 пудоў, ...ачысьціла-ж толькі 2.085 пудоў. Заданьне—сабраць попелу ў падшэфных вёсках—574 пуды, кожнаму комсамольцу па 2 пуды—ячэйкай ня выканана. На падшэфных вёсках попелу зусім не сабрана, а комсамольцамі—каля 5 пудоў.

Трыерам ячэйка павінна была ачысьціць 300 пудоў насеньня—а ачысьціла 610 пудоў.

Па організацыі садова-городнага таварыства ячэйкай конкрэтна нічога ня зроблена.

„Лёгкая Кавалерыя“.



Наносіць руйнуючы ўдар ворагу

На зьлёце „лёгкай кавалерыі“ Фрунзэнскага раёну

18-га студзеня ў памяшканьні дому партыйнай асьветы імя Карла Маркса адкрыўся зьлёт «Лёгкай Кавалерыі» Фрунзэнскага раёну. На зьлёце прысутнічала каля 400 делегатаў, а таксама і рабочыя ад некаторых прадпрыемств.

На першым пасяджэньні зьлёт заслухаў даклад старшыні МенАКК РСІ тав. Дамброўскага аб дзейнасьці АКК-РСІ.

Тав. Дамброўскі ў сваім дакладзе адзначыў, што работа АКК РСІ праходзіла і праходзіць па лініі ажыцьцяўленьня рашэньняў XV зьезду УсеКП(б) і XVI парт. конфэрэнцыі УсеКП(б), а таксама рашэньняў апошніх пленумаў ЦК УсеКП(б) і КП(б)Б.

Тав. Дамброўскі ў дакладзе прывёў шэраг фактаў скрыўленьня клясавай лініі ў рабоце савецкіх устаноў і організацый.

«Лёгкая кавалерыя»,—гаворыць тав. Дамброўскі,—павінна зьявіцца першым дапаможнікам у барацьбе з гэтымі скрыўленьнямі.

Пасьля дакладу тав. Дамброўскага зьлёт заслухаў даклад тав. Харкова аб чарговых задачах Фрунзэнскай організацыі ЛКСМБ—зьместу і формы працы „Лёгкай Кавалерыі“. Дакладчык прыводзіў шэраг фактаў як прыкладнай, а таксама і адмоўнай працы асобных груп і атрадаў «ЛК» у раёне.

Трэба зазначыць як перашкоду ў пасьпяховай працы зьлёту на значнае спазьненьне делегатаў. Напрыклад, першае пасяджэньне зьлёту пачалося на $1^{1}/_{2}$ гадзіны пазьней вызначанага часу.

Учора ўвечары ішлі спрэчкі па дакладах Дамброўскага і Харкова.

„Ваду“ прамоўца гаварыў...

29-га сьнежня 1929 году адбыўся зьлёт „Лёгкай Кавалерыі“ Азарыцкага раёну (Мазыршчына). Падрыхтоўчая праца да зьлёту, з боку раённага штабу і РК ЛКСМБ, была праведзена кепска, таму зьлёт і ня даў патрэбнага эфэкту. На зьлёт сабраліся 21 чалавек, а іх 3 чалавек з раёну. З некаторых комсамольскіх ячэек зусім не зьявіліся, напрыклад—з Ламавіцкай, у той час як атрад „Л. К.“ гэтай ячэйкі налічвае 60 чалавек.

Дакладчык па пытаньню барацьбы з бюрократызмам і чаляжах „Л. К.“ не падрыхтаваўся, аб чым ён нават заявіў на зьлёце і прасіў прабачэньня, таму некаторыя „кавалерыстыя“ засыналі. Ніводнага слова на зьлёце нельга было пачуць аб працы „Л К.“ на вёсцы, з усіх прысутных выказаліся 5 чалавек і тыя толькі з мястэчка. На зьлёце прысутнічала ўсяго толькі 2 партыйцы. Трэба сказаць, што зьлёт ня справіўся з сваімі задачамі і ў гэтым віна РК КСМ, які ня зладзеў правесьці добрай падрыхтоўчай работы.

Пагын

Што выявілі ў часе зьлёту?

На раённы зьлёт „ЛК“ Сьмілавіцкага раёну, які адбыўся 5-га студзеня г.г., зьявілася 50 делегатаў. Делегаты ў час працы зьлёту падзяліліся на тры сэкцыі: савецкую, сельска-гаспадарчую і вытворчую. Сэкцыі правялі абсьледваньне адпаведных устаноў. Напрыклад, сельска-гаспадарчая сэкцыя абсьледвала Корзунаўскі сельсавет, дзе выявіла, што сельсавет мала займаецца пытаньнем колектывізацыі, няма плану да веснавой пасеўкампаніі і падрыхтоўка не распачата; некаторыя сябры сельсавету, у тым ліку і сакратар, выступалі СУПРОЦЬ колектывізацыі.

Па збору падаткаў і страхоўкі сельсавет адстае і выканана толькі 75 пр. плану, самаабкладаньня ўзыскана толькі 16 проц. Ёсьць выпадкі, калі кулакі не плоцяць самаабкладаньня напрыклад, кулак Мпень.

Вытворчая сэкцыя праверыла працу арцелі шаўцоў і выявіла, што ў арцелі няма гадавога плану, рабочыя нічога ня ведаюць аб соцыялістычным спаборніцтве.

Савецкая сэкцыя зрабіла праверку працы міліцыі. Пасьля гэтага делегаты абменьваліся на зьлёце вопытам сваёй працы.

Г. Фрыд.

Узьнімем клясавую зіркасьць

У час падрыхтоўчай работы да зьлёту „Лёгкай Кавалерыі“ у Лагойскім раёне (Меншчына) выявілася, што комсамольскія ячэйкі на месцах дрэнна кіравалі групамі „ЛК“, амаль ні адна ячэйка не заслухоўвала справаздачы аб працы „Лёгкай Кавалерыі“. Часам комсамольцы „кавалерыстыя“ не давалі рашучага адпору кулакам і падкулачнікам, выступаючым супроць колектывізацыі. Такое зьявішча назіралася ў Дрыбенскай ячэйцы ЛКСМБ.

У саўгасе „Лагоза“ давалі ся даведкі вычышчаным і варожым элемэнтам. У Кузаўскім сельсавеце кулакі спойвалі „рускай горкай“ і „агітавалі“ беднякоў, каб яны не галасавалі за колгасы. На тэрыторыі Кузаўскага сельсавету, у кооперацыі дэфіцытны тавар адпускаўся сваякам і заможнікам, абвяжваліся беднякі.

У вёсцы Слабада загадчык складу былы паліцэйскі—Кузьміцкі конспэратыўным парадкам перадаў дэфіцытны тавар Лагойскім прыватным гандлярам. Гэтых фактаў „ЛК“ ня выкрыла.

У арцелі шаўцоў атрад „ЛК“ нічога не рабіў у той час, калі тавар у гэтай арцелі дрэнны, на што ўсе скардзяцца. Усе гэтыя недахопы і промахі ў рабоце „ЛК“ выявіліся на зьлёце.

Зьлёт „ЛК“ пастанавіў выклікаць на соцыялістычнае спаборніцтва групы „Лёгкай Кавалерыі“ Смілавіцкага раёну на наступных практычных мерапрыемствах:

Кожнай групе «Л. К.» уцягнуць у сваю працу не менш 10 чалавек батрацка-бядняцкай, саўгаскай і колгаскай моладзі.

Праверыць як выконваюцца дагаворы на соцыялістычнаму спаборніцтву; культ-масавую працу.

Праверыць падрыхтоўку да веснавай пасеўкампаніі сельсаветаў, райземчасткі, агрономі, колгасаў і саўгасаў раёну.

Лагойскай і Янушкаўскай групам „Л. К.“ зрабіць налёт на крэдытныя таварыствы з мэтай праверкі падрыхтоўкі да веснавой пасяўной кампаніі і задавальненьня сялян насеньнем.

Праверыць выкананьне будаўнічых планаў і на колькі рацыянальна скарыстоўваюцца сродкі ад самаабкладаньня.

У сувязі з суцэльнай колектывізацыяй трох сельсаветаў—Лагойскага, Паданкоўскага і Слабодскага групам «Л. К» перыодычна правяраць падрыхтоўку і ход самой працы па організацыі колгасаў.

Наглядаць за захаваньнем збожжа на ссыпных пунктах і за тым, як праходзяць лесанарыхтоўкі.

У сувязі з трохмесячнікам пролетарскай культуры беларускай і нацыянальных меншасьцяў, праверыць, што ў гэтым напрамку зрабілі хаты-чытальні, чырвоныя куткі, бібліотэкі і г. д.

Бірук.

ВОСЬ ЯНЫ КУЛАЦКІЯ ПАДПЯВАЛЫ

Нядаўна на старонках газэты „Чырвоная Зьмена“ пісалася аб той згушчонай атмосфэры ў Беларускай Дзяржаўнай Бібліотэцы, якая зараз маецца і дзе партыйна-комсамольскаму актыву надта цяжка ўдаецца праводзіць тыя ці іншыя мерапрыемствы партыі.

Пасябраваўся

Хто спараджае гэтыя цяжкасьці? Хто галасуе супроць таго, што праводзіцца у бібліотэцы, у сувязку з узятым курсам і перашкаджае ўвязваць культурнае будаўніцтва з тэмпамі соцыялістычнага будаўніцтва?

Людзі з яўна-варожымі імкненьнямі, людзі, якія ня могуць пагадзіцца з лініяй партыі і савецкай улады, знашлі сабе месца ў бібліотэцы і вядуць групоўкаю работу супроць таго, што намячаецца праводзіць ў жыцьцё. Напрыклад, супрацоўніца Баран замест таго, каб дапамагчы маладой супрацоўніцы бібліотэкі комсамольцы Роткінай у яе рабоце, даць практычныя парады,—ня толькі не робіць гэтага, але, наадварот,—прымае ўсе захады, каб выжыць яе з бібліотэкі. Трэба сказаць, што ў бібліотэцы згуртаваліся людзі, якія супольна вядуць варожую лінію, а часам і яўна-шкодную работу, накіраваную супроць усіх мерапрыемстваў здаровага партыйнага комсамольскага актыву і іншых беспартыйных працаўнікоў.

Зусім зразумела чаму гэтая „групоўка“ драпежна адносіцца да Роткінай. Яна ж у рэдколегіі, яна — у мясцкоме, яна бязьлітасна змагаецца з усім варожым і шкодным у мурох бібліотэкі.

Таксама не паважаюць і іншых актывістых, якія па бальшавіцку змагаюцца з гэтай групоўкай.

Пад уплыў гэтай групоўкі падпаў і комсамолец Шушкевіч, які пачынае скакаць пад іхнюю дудачку і трымае сябе не па-комсамольску.

А вось другі—М. Улашчык. Ён скончыў БДУ, пралезшы туды пад маскай серадняка, а сапраўды зьяўляецца сынам буйнага кулака. Увесь час захоўваў сваё паходжаньне і цяпер трымае цесную сувязь з сваім бацькам.

Па думцы Улашчыка у Чырвоную армію (кадр) прымаюць толькі комсамольцаў і партыйцаў, ён-жа не папаў у Чырвоную армію толькі таму, што беспартыйны. Ён ня хоча сказаць праўду, што ў Чырвоную армію не папаў як сын кулака.

Ад грамадзкай працы у бібліотэцы Улашчык ухіляецца і на кожным кроку падрывае работу, компромэтуючы сумленных працаўнікоў і інш.

Аднойчы было даручана „комсамольцу“ Шушкевічу, які добра ведае Улашчыка, высьветліць яго соцыяльнае становішча, але... як гэта Шушкевіч будзе „тапіць“ свайго хлапца. І ўвесь час адцягваў і не высьвятляў справу... Гэта яўнае падтрыманьне кулака не знайшло належнага адпору з боку комсамольскай ячэйкі.

Мясцком на пашыраным сваім паседжаньні абгаварваў пытаньне аб Улашчыку. Здаецца ўсім ясна, што такога трэба гнаць з бібліотэкі і профсаюзу. Але... пэўная групоўка, падтрымліваючы яго пры галасаваньні, галасавала супроць зьняцьця Улашчыка з працы.

Зразумела, рашэньне мясцкому прашло, але тут характэрны самы фон клясавай барацьбы, які маецца ў бібліотэцы.

Калі напісан быў артыкул аб Улашчыку ў пасьценгазэту, дык гэты самы Шушкевіч, які на вялікі жаль працуе чамусьці ў рэдколегіі, сказаў:

— „У-ж слишком резко написано, нельзя ли иначе“.

Зусім зразумела, чаму групоўка любіць «комсамольца» Шушкевіча. Комэнтарыі непатрэбны.

Неабходна партыйна-комсамольскаму актыву яшчэ з большай энэргіяй рваць павуціну, якая заплялася ў бібліотэцы.

Шушкевіча жалезнаю мяцелкаю трэба гнаць з комсамолу. Ён сёньня комсамолец, а заўтра, на адкрытай клясавай бойцы, ён—здраднік. Трэба таксама ўзьняць пытаньне, ці можа ён наогул заставацца на працы ў Бел. Дзярж. Бібліотэцы ў якасьці савецкага працаўніка.

Жыцьцё рэзка галасуе за тэрміновае аздараўленьне атмосфэры ў бібліотэцы.

З—т.

Выстаўка тэхнічнай кнігі

19-га студзеня г. г. у будынку Беларускай Дзяржаўнай Бібліотэкі адчынілася выстаўка тэхнічнай кнігі. Не гледзячы на цеснае памяшканьне, а таксама на кепскае абсталяваньне выстаўка мае надзвычайна добры выгляд.

Першы дзень ее працы прыцягнуў шмат экскурсантаў, студэнтаў і служачых, але няма пакуль што экскурсій ад заводаў і фабрык.

На выстаўцы прадстаўлены наступныя аддзелы: будаўніцтва, будаўнічыя матар'ялы, паравыя катлы, рухавікі, цеплотэхніка, кераміка і шкло, транспарту і сувязі; дрэваапрацоўчая, гарбарная, тэкстыльная, харчовая, папяровая, поліграфічная і хэмічная вытворчасьць. Абсталяваны таксама багатыя аддзелы даведчай літаратуры і бібліографіі па тэхніцы.

Выстаўка будзе адчынена да 26-га студзеня. Уваход бясплатны.

С. Ш.

Патрабуем растрэлу забойц[illegible] Прахіро

Мы, сябры колгасу „Зялёны Луг“, і жыхары вёскі Міхалова і Цераховіч, у час пахаваньня Прахіро Язэпа,—батрака, які першы ўступіў у колгас і ўпарта змагаўся за соцыялістычную перабудову вёскі, за што загінуў у клясавым змаганьні ад кулацкай кулі, патрабуем ад пролетарскага суду прымяненьня да забойцаў тав. Прахіро вышэйшай меры соцыяльнай абароны —растрэлу.

Разам з тым запэўніваем ко[illegible] тычную партыю і савецкую [illegible] што варожыя выступленьні ку[illegible] ня спыняць разгортваньня пра[illegible] колектывізацыі і яшчэ больш р[illegible] га наступленьня на кулака. Н[illegible] ганебны учынак мы адкажам [illegible] леньнем у колгас і дапамогай [illegible] ў ліквідацыі кулацтва, як клясы.

Протэст падпісан на магіле та[illegible] хіро 51 чалавекам.

Крытычны агл[illegible]

Трэба аздаравіць рэпэртуар рабочай эстр[illegible]

17-га студзеня, у перапоўненай зале клюбу скурнікаў адбыўся на грамадзкі прагляд Мюзік-Холу, які прыехаў з Масквы для абслугоўваньня рабочых клюбаў, заводаў і фабрык гор. Менску ў часе абедзеных перапынкаў.

Артыстыя Мюзік-Холу накіраваны сюды ЦУГЦ'ам (Центральное Управление Государственными Цирками). Сярод іх: расказчык юмарысты, сьпявак, гарманісты, танцоры і „Чарлі Чаплін“ — музычная эксцэнтрыка.

Агульнае ўражаньне ад усіх нумароў застаецца добрае. Шмат бадзёрасьці, жыцьцярадаснасьці, усё гэта падносіцца досыць мастацкі і ажыўлена.

Пры ўсёй здольнасьці артыстых, трэба, нажаль, констатаваць, што сучаснага жыцьця яны не адбіваюць. ЦУГЦ, перад адпраўкай гэтай групы, даў ёй належны „інструктаж“, у выніку чаго артыстыя ня маюць ніводнага нумару да прадсталчых ленінскіх дзён.

Яшчэ раз мы павінны біць трывогу і констатаваць, што ў нашых мастацкіх кадрах, у даным выпадку артыстых эстрады,—шмат людзей апалітычных, людзей нічым не зьвязаных з політычным жыцьцём нашай краіны з тэмпамі соцыялістычнага будаўніцтва. Артыстыя напрыклад, прыехалі ў Беларусь, дзе велізарным тэмпам праходзіць суцэльная колектывізацыя вёсак і раёнаў, а у іх няма ніводнага нумару аб колектывізацыі сельскай гаспадаркі. Тое самае і з соцыялістычным спаборніцтвам,—быццам гэтага ў нас і ня існуе

Здольная артыстка Інсарава заявіла: „Я уже 12 лет на сцене, работала в рабочих районах, но я не знала, что нужно что-нибудь к ленинским дням приготовить“. Артыстка з першага дня Кастр[illegible] кавай рэволюцыі на са[illegible] эстрадзе і ня ведае, што ен[illegible] трэба даць добрую, клясав[illegible] трыманую програму наогул [illegible] прыватнасьці у ленінскія дні.

Дрэнна яшчэ і тое, што [illegible] літы ў розных гарадох пра[illegible] па рознаму, напрыклад, [illegible] тую-ж рэч Ленінградзкі Га[illegible] дазваляе пад літарай „а“, [illegible] лепшае), а ў другіх гарадо[illegible] тую-ж рэч забараняюць да [illegible] наньня.

Прадстаўнікі рабочых к[illegible] профэсыйных організацый Га[illegible] далі сапраўдную здаровую кр[illegible] ўсяго таго, што было на праглядзе. Усё лепшае — ух[illegible] каб гэтым запоўніць рабочую [illegible] ду, як у рабочых клюбах, т[illegible] непасрэдна на вытворчасьці [illegible] абедзеных перапынкаў.

У далейшым пажадана рабі[illegible] кія грамадзкія прагляды арт[illegible] (асабліва прыежджых гастр[illegible] з тым, каб абараніць рабочу[illegible] ну ад халтурчыны і хо[illegible] Прычым саюзу Працмастацтва[illegible] ходна вынікі гэтых праглядаў [illegible] каць да ведама і ўзмацніць [illegible] ваўчую працу сярод сяброў [illegible] саюзу.

Культурныя патрэбы пра[illegible] узрастаюць у ногу з тэмпам [illegible] ніцтва, мастацкія кадры да[illegible] далёка адсталі ад жыцьця, [illegible] руючыя саюзныя органы по[illegible] шаюцца.

І. Люб[illegible]

Папраўка

У № 16 (984) „ЧЗ“ за 19 с[illegible] ня на 2-й старонцы газэты [illegible] тыкуле „Пункты практычнай [illegible] ты“ напісана Талочынская [illegible] а трэба чытаць ТАТАРЫЧЫН[illegible] ЯЧЭЙКА.

„Чырвоная Зьмена“ дапамагла

„За вушка, ды на сонейка“

Праз юнкораўскія допісы „Чырвоная Зьмена“ выкрывае і наносіць моцны ўдар па праваднікох варожых спраў

У „Чырвоную Зьмену“ быў прысланы допіс пад назвай „Хто дапаможа“ у якім пісалася, што ў в. Заборʼе, Вітуніцкага сельсавету, Бягомльскага раёну маюцца баптыстыя, якія праводзяць варожую агітацыю. Бягомльскі РК КП(б)Б паведамляе, што па гэтай справе прыняты захады, **ГЛАВАРЫ БАПТЫСТЫХ АРЫШТАВАНЫ І ЗА КОНТР-РЭВОЛЮЦЫЙНУЮ ПРАЦУ АДДАЮЦЦА ПАД СУД.**

* * *

У № 279 газэты „Чырвоная Зьмена“ зьмешчан допіс пад назвай: „Пасябраваўся з кулакамі“, у якім пісалася, што старшыня Васковіцкага сельсавету, Глускага раёну (Бабруйшчына) Марціновіч зжыўся з кулакамі.

ЦКК НК РСІ паведамляе, што **МАРЦІНОВІЧ ВЫЧЫШЧАН З АПАРАТУ ПА ПЕРШАЙ КАТЭГОРЫІ І СПРАВА ПЕРАДАДЗЕНА Ў НАРСУД.**

* * *

На прысланы ў рэдакцыю допіс: „Настаўніца-падкулачнік“, у якім пісалася, што настаўніца Сярнова Вера, в. Шапілёўка, Маслоўскага сельсавету, у час хлебанарыхтовак, выступала супроць гэтых мерапрыемстваў, Копыльскі РВК паведамляе, што факты адпавядаюць сапраўднасьці і **СЯРНОВАЙ ВЫНЕСЕНА СУРОВАЯ ВЫМОВА.**

* * *

На прысланы ў рэдакцыю допіс пад назвай: „Чаму яшчэ трымаюць“ аб студэнце Аршанскага пэдтэхнікуму Ждановічы М. Наркамасьветы паведамляе, што пастановай пэдсавету тэхнікуму **ЖДАНОВІЧ З ТЭХНІКУМУ ВЫКЛЮЧАН.**

* * *

У „Чырвоную Зьмену“ быў прыслан допіс пад назвай: „Больш увагі нашай зьмене“, аб тым, што ў Бабруйску, у дзіцячым доме імя Леніна, адсутнічае выхаваўчая праца, матар'яльнае становішча—кепскае і г. д. Акруговае таварыства „Прыхільнік дзяцей“ паведамляе, што факты ў допісу пацьвердзіліся. Прымаюцца рашучыя меры па паляпшэньню выхаваўчай працы і матар'яльнага становішча ў дзетдоме.

* * *

На прысланы ў рэдакцыю „Чырвонай Зьмены“ допіс аб тым, што ў Лучнікаўскай сямігодцы, Слуцкага раёну (Бабруйшчына), давалася дапамога вучням, якія плацяць падатак; у інтэрнат былі прыняты вучаніцы, якія плацяць 40-46 руб. падатку, у школе наглядаліся выпадкі антысемітызму з боку вучняў і г. д. Слуцкі РВК паведамляе, што загадчыку сямігодкі прапанована прыняць захады да ліквідаваньня ўсіх зьявішч, паказаных у допісу.

* * *

На прысланы ў рэдакцыю допіс, пад назвай: „Сумныя факты ў працы і паводзінах загадчыка Керытнянскай дзеткалёніі Шчаковіча“, Бабруйская АКК паведамляе, што па даведцы Асіповіцкага райкому партыі, Шчаковіч з працы зьняты і прыцягнуты да судовай адказнасьці.

* * *

У рэдакцыю „Чырвонай Зьмены“ быў прыслан допіс аб тым, што ў Дукорскай сямігодцы, Сьмілаўскага раёну (Меншчына), вучыцца дачка рабіна—Майзель. Сьмілавіцкі РВК паведамляе, што дадзен загад школе зараз-жа яе выключыць.

* * *

У № 272 „Чырвонай Зьмены“ зьмешчан допіс пад назвай: „Хто есьць больш, таму сад“, у якім пісалася, што Лагойскі райвыканком (Меншчына) здаў прыватніку ў арэнду сад, колгасу-ж „Зялёны Луг“ райвыканком у арэндзе саду адмовіў, ня гледзячы на падаваную колгасам заяву. Праз Менскую акруговую пракуратуру РВК паведамляе, што сад быў здан з таргоў. Гэта пытаньне разьбіралася ў Мен. АКК, памылка РВК прызнана і за гэта ён панёс кару.

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

Вучню комсамольцу—„Пра Заслаўскую сямігодку“. **Лісаўчыку**—„Адбыліся перавыбары КСУ“, „Вучні аб колектывізацыі“. **Дрэверу** — „Беднага патрабуе абкладваць недаабкладзеных“. **Студэнту** — „Шэфпраца“, **Слухачу**—„Пра школу малапісьменных“, **Чаромаху** — „Бярэ с прыклад“, **Фойку**—„Няпрыемная справа“, **Вучню**—„Няма выхаваньня“, **Белішаву**—„Аб колектывізацыі Старадворскага сельсавету“, **Барозну**—„Пра настаўніка двухкомплектнай школы“, **Аўтару заметак**—„Пра колдагавор Аршанскага хлебазаводу“ і „Колектывізацыі ў Аршанскай акрузе“. **Рамлоўскаму** — „Школьнае жыцьцё любіць планавасьць“. **Комсамольцу**—„Мы таксама ліквідуем няпісьменнасьць“. **Зільбэрману** — „Як актыў праводзіць сход“, **Комсамольцу**—„Не было працы“. **В. Н.**—„Быстранская ячэйка—у прыклад другім“. **Х.**—„Гарсавет, больш увагі!“, **Ліхману**—„І мы дапамагаем у працы атраду“, **Жолуду**—„45 пудоў дзяржаве“, **Бузе**—„Дапамажыце атрымаць дакумэнты“, **Кастусю**—„Справа друку ў сьценах школы“, **Акулічу**—„Па руках гальвяцоў“, **Чубару** — „Чаму зацягваюць землеўпарадкаваньне“, **Хадкевічу** — „Не прызнаюць і ня зьнімаюцца“, **Розну**—„Сорам настаўнікам ня ўдзельнічаць“, „За чыстату кустарна-промысловай коопэрацыі“, **Р. Н.**—„Бядняцка-серадняцкая частка ўзварухнулася“, **Горкаму**—„Сельсавет сьпіць“, **Школьніку**—„Адны вучкі, а ня роўна ведаюць“, **К. Я.** — „Цёмна“, **Анатолю Хмяльнюку**—„Больш увагі гуртку бязбожнікаў“, **Вуху** — „Хто-ж першы?“, **Чуўшаму**—„Пра школу“, **Фрыду**—„Сіламі комсамольцаў організавалі колгас“, „Праверыць дагаворы“. **Дубінду**—„Пра вячэрнюю школу малапісьменных“, **Пукалу**—„Першыя крокі“ „За колектывізацыю“. **Марго**[illegible] „Колектывізацыя Верхменскага савету“, **Ведотаву К.**—„Праца[illegible] карысьць колектывізацыі“, **Ля**[illegible] „Рэзолюцыя“, **Янук**—„Каляды [illegible] самоле“, **А. Х.**—„Добры мэтад“ [illegible] **кевічу**—„Комсамол павінен [illegible] шым“, „Антырэлігійная праца [illegible] вай моладзі“, „**Абгаму Навале**[illegible]—„Комсамольцы і вучні ВШ[illegible] каляднаю вячорку“, **Гэльперу** [illegible] проць рэлігіі“—вашы допісы [illegible] шчацца ня будуць, як дробя[illegible] закранутых у заметках пытань[illegible] ім напісаць у масьцовыя газ[illegible] зьявіць у адпаведныя мясцовыя [illegible] нізацыі.

КомКамольскі календ[illegible]

Сёньня 20-га студзеня, а 7-ай ўвечары ў памяшканьні ЦК адбудзецца першае паседжаньне штабу 3-х месячніку па прав[illegible] ўсебеларускага політ-бою.

На паседжаньне запрашаюцца: Савіч (Комвуз). Карнейчык (В[illegible]), Грыб (Комунар), Пазаротны (Б[illegible]) біксон (Дом Комсамолу), Ка[illegible] (Чырвоная Зьм.), прадстаўнік [illegible] самолу Меншвею, прадстаўнік [illegible] лектыву „Бальшавік“, прадста[illegible] колектыву чыгункі, Ратнэр (Х[illegible]) АПО Кастрычн. РК АКСМБ, Пера[illegible] РК АКСМБ). Рубінчык (АК АКС[illegible])

Адказны рэдактар [illegible]

Рэдколе[illegible]

Менск, друкарня ВДВ.

Галоўлітбел № 599